*Вольга Прыемка*

# ЗАКЛІНАЛЬНЫЯ ПЕСНІ

Заклінальныя песні – жанравая разнавіднасць абрадавых, якія выконваліся ў межах каляднай, масленічнай, валачобнай, юраўскай, траецкай, купальскай, жніўнай абраднасці беларускага земляробчага календара, у радзінных і вясельных комплексах сямейна-абрадавага цыкла. У беларускай фалькларыстыцы вылучалі і даследавалі Г. Барташэвіч, А. Фядосік, Н. Гілевіч, М. Грынблат, А. Гурскі, А. Ліс, В. Новак, Р. Кавалёва і інш. Даследчыкі па-рознаму вызначаюць спецыфіку і жанравыя межы заклінальных песень. Улічваючы генезіс твораў, адны вучоныя адзначалі, што жанравым паказчыкам песень-заклінанняў з’яўляецца магічная функцыя. Другія выказвалі меркаванне, што заклінальныя песні – творы, якія ў якасці абавязковага кампанента ўключаюць заклінанне. Трэція акцэнтавалі функцыянальную спецыфікацыю заклінальных песень – заклінанне звышнатуральных сіл, з’яў прыроды, розных прадметаў навакольнага свету і нават лёсу. Але ўсе даследчыкі сыходзяцца ў тым, што аснова гэтых паэтычных твораў – вера ў магічную сілу слова, якім нібыта можна ўздзейнічаць на чалавека або прыроду. Адсюль вынікае такая характэрная адзнака песень-заклінанняў, як іх імператыўны, загадны тон. Заклінальныя песні маюць формульны характар, вызначаюцца ўстойлівым зместам і пастаянным месцам у абрадзе. Па вонкавай форме песні-заклінанні – гэта лаканічны зварот, таму што іх мэтавая ўстаноўка заўсёды канкрэтная: паўздзейнічаць, загадаць, радзей – папрасіць. Прамы зварот адрасуецца розным аб’ектам: полю, ураджаю і інш. Так, абрадавыя песні калядоўшчыкаў закліналі не толькі на добры ўраджай збажыны («*Радзі, поле, жыта, жыта і пшаніцу, усякую ярыцу*»), але і на ўрадлівы лён («*Залатое ды насеннейка, срэбранае ды карэннейка, зарадзі шаўковы лён*»), і багаты прыплод. Зварот можа быць звязаны з прадуцыравальнай магіяй, у такім выпадку часцей звяртаюцца да Бога, святых. Напрыклад, у веснавой песні: «*Зарадзі, божа, на жытачка род, на статачак плод, людзям на здароўе*». Або ў юраўскай песні зварот да святога – заклінанне даць жыццё ўсяму жывому (траве, жывёле) з канкрэтнаю мэтаю: «*Людзям на здароўе*».

У беларускім вяселлі раней заклінальныя песні традыцыйна пачыналі ўсе важнейшыя этапы і нават асобныя элементы. Так, з самага пачатку вяселля просяць Кузьму-Дзям’яна, каб ён скаваў моцную «*свадзебку вечную-даўгавечную*», такую, што «*людзі судзяць – не рассудзяць, ветры веюць – не развеюць, дажджы мочуць – не рамочуць, сонца сушыць – не рассушыць*», а таксама каб была «*свадзебка на чатыры раданькі: першая раданька – на жыццё багатае, другая раданька – на доўгі век, трэцяя раданька – на сыноў-пахароў, чацвёртая раданька – на дачок, на женячак*». Звяртаюцца да роду, бацькоў, багародзіцы, бога благаславіць пачаць (згуляць) вяселле. Адпраўляючыся пад вянец, маладая заклінала сваю вянчальную долю («*Павіся, расадка, ў качанне, а ўдайся, доля вянчальна*» і прасіла даць ёй у

новай сям'і «*свёкарку – роднага татку, свякроўку – родную матку, дзеверка – роднага брата, залаваньку – родную сястрэньку*». У каравайным абрадзе нават кожны працэс прыгатавання рытуальнага хлеба пачынаўся з заклінальных песень, якія складаюцца са звароту да звышнатуральных сіл, бога і кароткага маналога-просьбы: «*Да спары, божа, да нашаму караваю, да злучы ж, божа, да нашу парачку*».

У сучаснай фальклорнай прасторы азначэнне заклінальных песень дастаткова ўмоўнае, таму што ў «чыстым» выглядзе гэтыя творы амаль не захаваліся: хутчэй гэта заклінальныя матывы, кампаненты ў песнях побач з іншымі семантычна і функцыянальна абумоўленымі часткамі. Заклінальныя матывы часта ўключаюцца ў велічальныя песнì – стадыяльна больш позвнія, чым заклінальныя, але функцыянальна блізкія да іх. Відаць, развіццё жанру велічальных песень адбывалася асабліва інтэнсіўна, а іх мэтавая ўстаноўка паказаць жаданае як бы ўжо існуючым дзеля набліжэння і ўвасаблення яго ў рэальным жыцці садзейнічала выцясненню заклінальных песень, формульны характар якіх абмяжоўваў развіццё жанру невялікай колькасцю тэкстаў.

***Вольга Прыемка***

## ЗАПОІНЫ

Запоіны (*малыя заручыны, малая гарэлка, барышы, карандаш, запівіны*) – адзін з падрыхтоўчых этапаў вяселля, на якім нявеста і яе бацькі ў прысутнасці самай блізкай радні афіцыйна давалі згоду на шлюб. Звычайна адбываліся пасля сватання. На запоіны прыязджалі бацька, хросны бацька, дзядзька жаніха, у некаторых мясцовасцях цётка або хросная маці. Даўней запоіны адбываліся без жаніха, у больш позні час яго прысутнасць стала абавязковай.  Адпраўляліся на запоіны ўвечары, ціха. Каб запоіны былі паспяховымі, маці жаніхя перад выездам да нявесты (згодна з павер'ем) завязвала разам вілкі, качэргі поясам, а сваты, увайшоўшы ў хату да нявесты, дакраналіся да печы, не пераходзілі за першую бальку, не атрымаўшы папярэдняй згоды на запоіны. У знак згоды маці або сама дзяўчына засцілала стол і ставіла чарку, закуску. Сват клаў на стол загорнуты ў ручнік бохан хлеба, спечаны маці жаніха, і бутэльку гарэлкі, заткнутую саломай. Абавязковай стравай была яешня і сыр. Таму і казалі: «запілі» дзяўчыну або «заелі яешняй (сырам)». На запоіны дзяўчына запрашала самых блізкіх сваякоў і сяброўак. Калі ўсе збіраліся, яе пачыналі запіваць. Звяртаючыся да бацькоў навесты або да яе самой, сват адпіваў з чаркі, клаў туды манетку, якую дзяўчына забірала пасля таго, як таксама выпівала з чаркі. Песнì для гэтага выпадку выбìраліся адвольна. Абавязкова выконваліся  песнì «*Ой, піў бацька, піла маці*», «*Запìта дзеванька, запìта*», «*Прапіла маці дочку*», «*Ой, прапою, прапою*» і іншыя. У час запоін нявеста нярэдка абдорвала сватоў ручнікамі, наміткамі, хусткамі. Маці дзяўчыны забірала прывезены сватамі хлеб, узамен давала ім свой, а ў бутэльку, дзе была гарэлка, насыпала жыта і

абвязвала поясам, што таксама сімвалізавала згоду. На заручынах абвяшчалі аб будучым вяселлі, пасля чаго маладыя афіцыйна лічыліся жаніхом і нявестай. Праўда, адмова з кожнага боку была яшчэ магчымай. У гэтым выпадку дзяўчына павінна была заплаціць за прывезеную хлопцам гарэлку, а жаніх і яго сваякі – вярнуць падарункі, атрыманыя ад нявесты.